*У.І.РЫНКЕВІЧ*

# ТЫПАЛІТАГРАФІЯ НА МІНШЧЫНЕ СТО ГАДОЎ ТАМУ
## (з архіўных крыніц)

Вынаходніцтва ў канцы XVIII ст. літаграфіі, а ў пачатку наступнага стагоддзя друкарскай машыны азначылі прамысловую рэвалюцыю ў паліграфіі. У Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі, куды ўваходзіла сучасная тэрыторыя Беларусі, у другой палове XIX ст. шырокае распаўсюджанне атрымалі друкарні з літаграфскімі аддзеламі – тыпалітаграфіі. Тут друкаваліся перыядычныя выданні, а таксама прыкладная графіка рознага кшталту. Галоўнымі паліграфічнымі прадпрыемствамі лічыліся казённыя губернскія друкарні, але асноўную колькасць складалі невялікія прыватныя друкарскія майстэрні. Усяго ў пачатку XX ст. у Беларусі налічваліся 123 друкарні і літаграфічныя прадпрыемствы [1]. У 1908 г. у Мінску, паводле звестак "Ведомостей типографий, литографий и т.п. заведений, производящих тиснение в Минской губернии", афіцыйна дзейнічалі 23 прыватныя друкарні, большасць з якіх мелі літаграфскія станкі. У дзевяці паветах Мінскай губерні былі зарэгістраваны яшчэ 28 "установ, дзе рабілася ціснение" [2]. Такая колькасць друкарскіх прадпрыемстваў, паводле ацэнкі губернскіх улад, цалкам забяспечвала патрэбы ў паліграфічнай прадукцыі [3].

У Мінску ў пачатку XX ст. з найбольш буйных прыватных прадпрыемстваў вылучаліся тры тыпалітаграфіі. Гэта літаграфіі Б.Саламонава, І.Тасьмана і Ш.Дворжыца. Дзейнічала таксама адна прыватная фотацынкаграфічная майстэрня Л.А.Рэзенбурга, дзе тыражаваліся малюнкі і фатаграфічныя выявы. Сярод павятовых прадпрыемстваў вядомасцю карысталіся літаграфіі А.Г.Данцыга (заснавана ў Навагрудку ў 1896 г.), А.Л.Сольца (Пінск,1883 г.), Ш.М.Сохара (Бабруйск,1895 г.), удавы Р.Вільковіч (Пінск, год заснавання не выяўлены) і інш.

Аснашчанасць тыпалітаграфій на тыя часы была зусім не кепскай. Буйнейшыя з іх мелі вялікія паравыя друкарскія машыны. Напрыклад, прадпрыемствы Саламонава і Дворжыца мелі па адной такой машыне. Акрамя таго, у Саламонава былі зарэгістраваны чатыры літаграфічныя станкі і гравёрная штампавая майстэрня, 400 пудоў шрыфту. Друкарня, якой валодаў мінскі мяшчанін Ільля Тасьман з сынамі Вульерам і Рубінам, была аснашчана чатырма паравымі друкарскімі машынамі з дапаможнымі цэхамі [4].

У буйных тыпалітаграфіях размяшчаліся заказы на друкаванне мясцовых перыядычных выданняў і тэатральнай рэкламы. З мастацкага пункту гледжання найбольшую цікавасць выклікаюць афішы да спектакляў, канцэртаў, цыркавых паказаў. Захаваліся некалькі дзесяткаў узораў прадукцыі тыпалітаграфій Саламонава і ўдавы Вільковіч. Гэта афішы да спектакляў і цыркавых паказаў 1879–1880 гг. [5]. У асноўным афішы ўяўляюць тэкставыя кампазіцыі памерам ад 1/4 да поўнага аркуша (90×70 см) з манахромнымі чорнымі або чырвонымі літарамі на белым, радзей на цёмным фоне. У некаторых літаграфіях з часам сфарміраваліся ўстойлівыя стылістычныя рысы афармлення плакатнай прадукцыі. Напрыклад, афішы тыпалітаграфіі Саламонава адрозніваліся вялікай разнастайнасцю шрыфтоў (больш за 20 відаў на адным аркушы), архітэктанічнасцю кампазіцыі размяшчэння тэкставых радкоў у спалучэнні з арнаментальнымі адбіўкамі, віньеткамі і піктаграмамі (часцей рука з указальным пальцам). У пэўнай ступені гэтыя афішы можна назваць папярэднікамі на беларускай глебе канструктывісцкіх эксперыментатараў Э.Лісіц-кага, М.Малевіча і іншых мастакоў-авангардыстаў у прыкладной графіцы паслярэвалюцыйных гадоў. Характэрнай асаблівасцю афіш друкарні ў Пінску (удавы Вільковіч) было спалучэнне тэкставай часткі з ілюстрацыйнай застаўкай – сюжэтным фігуратыўным малюнкам, выкананым ў тэхніцы лінарыту. Ананімныя выявы ў стылі наіўнага прымітывізму, якія паказваюць "дзеянне магіка-чарадзея", "работу паветраных акрабатаў на вуліцы", не прэтэндавалі на мастацкую каштоўнасць, але падобна народным лубкам выклікалі цікавасць публікі і тым самым забяспечвалі выкананне сваёй прамой рэкламнай функцыі.

Канкурэнцыя ў паліграфічнай сферы на тэрыторыі Беларусі значна ўзрасла, калі ў 1890-х гг. з Германіі пачалі паступаць невялікія па памерах высокапрадукцыйныя друкарскія машыны. Друкарскія майстэрні ("общежитейские печатни", як іх звычайна называлі) з'явіліся спачатку ў Мінску і павятовых гарадах цэнтральнай губерні. У той жа час (1899) у Віцебскай губерні такіх міні-друкарняў яшчэ не было. У большасці гэта былі невялікія майстэрні, якія месціліся ў прыватных дамах і былі абсталяваны адной-дзвюма друкарскімі машынамі (папулярнасцю карысталіся машыны нямецкай вытворчасці "Фабрыкі Айхеля і Бахмана") і ручным літаграфскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станком. Друкарскія машыны з наборам прыстасаванняў да іх, розныя друкарскія рыштункі, шрыфты дастаўляліся пад пільным паліцэйскім кантролем непасрэдна з-за мяжы або перакупляліся ў польскіх ці літоўскіх прадпрымальнікаў. У сярэднім у друкарнях мелася прыблізна 40–60 пудоў наборнага шрыфту, некалькіх гарнітур і 5–6 літаграфскіх камянёў розных памераў. Існаванне маленькіх друкарняў было нядоўгім, каля 5–6 гадоў, што сведчыла, з аднага боку, аб жорсткай канкурэнтнай барацьбы пры нізкім прафесіяналізме іх уладаль-нікаў, а з другога – аб моцным ціску з боку цэнзуры і паліцэйскага нагляду [6].

Ва ўласных тыпалітаграфіях выконваліся дробныя паліграфічныя заказы: візітныя карткі, аб'явы, бланкі, а таксама малатыражныя кніжныя выданні, іншая прадукцыя для асабістых патрэб. Некаторыя з друкарняў мелі імянныя бланкі, асабісты фірменны стыль з мастацка распрацаваным лагатыпам (тыпалітаграфія А.Г.Шымановіча ў Рэчыцы). У некаторых друкарняў дзейнічалі гравёрныя майстэрні (прадпрыемствы І.З.Ісакава, А.Г.Раскіна і інш.), дзе выраблялiся каўчукавыя штэмпелі, пячаткі (у прыватнасці настаўнікам, урачам) для службовых мэт і асабістых патрэб грамадзян [7].

Найбольш выгадныя доўгатэрміновыя казённыя заказы размяркоўваліся на конкурснай аснове, прычым удзел у конкурсах прадстаўнікоў з іншых губерняў абмяжоўваўся або ўвогуле забараняўся. Аб гэтым сведчыць прашэнне ўладальнікаў друкарняў з Вільна А.Мінскера і А.Зака аб адкрыцці тыпалітаграфіі ў Мінску з мэтай удзелу ў конкурсе на адзін з дзяржаўных заказаў па выкананні тыпаграфічных, літаграфскіх і пераплётных прац на працягу трох гадоў [8]. Выжываць у бескампраміснай канкурэнтнай барацьбе прыходзілася не толькі дробным, але і буйным паліграфічным прадпрыемствам. З гэтай нагоды прадпрымальнікі вымушаны былі шукаць магчымасць адкрыцця тыпалітаграфій у іншых губернях і маленькіх павятовых гарадах. Так рабіў, напрыклад, Тасьман, які падаваў прашэнні на адкрыццё друкарняў ў Магілёве, Вільні, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах.

Уладальнікамі невялікіх прыватных тыпалітаграфій у асноўным былі купцы 2-й гільдыі, радзей стацкія саветнікі, мяшчане і нават сяляне. У большасці гэта былі людзі яўрэйскай нацыянальнасці. Адукацыю ў асноўным мелі дамашнюю, толькі некаторыя з іх скончылі казённыя яўрэйскія вучэльні. Таму многія валодалі рускім пісьмом кепска і ўвогуле не ведалі беларускай мовы. Большасць з прадпрымальнікаў пачыналі друкарства без якой-небудь падрыхтоўкі ў гэтай справе, але асобныя з іх валодалі вялікім прафесійным вопытам друкарства – па 20 гадоў і болей. Напрыклад, І.М.Зархін, які спецыяльна вывучаў літаграфскую справу, займаўся гэтай прафесіяй 22 гады, А.Г.Раскін – 25 гадоў. Вышэй узгаданы І.Тасьман 15 гадоў служыў старшым наборшчыкам у губернскай друкарні (з 1862 г.), а пасля адкрыў сваю прыватную справу, адпрацаваўшы ў гэтай галіне больш за 40 гадоў. Прыблізна столькі ж часу аддаў паліграфіі Б.Саламонаў.

У Паўночна-Заходнім краі, сацыяльна выбуханебяспечным рэгіёне Расійскай імперыі, царскія ўлады праяўлялі асаблівую асцярожнасць у развіцці друкарскай прамысловасці. Яны бачылі ў тыражнай прадукцыі моцны сродак палітычнай прапаганды супраць самадзяржаўя і нацыянальнага ўціску. Пасля паўстання 1863–1864 гг. разам з масавымі рэпрэсіямі, секвестрам маёнткаў, абкладаннем штрафамі кляштараў і каталіцкага духавенства, закрыццём некаторых устаноў нагляд за прыватнымі прадпрыемствамі значна ўзмацніўся, што ўскладніла адкрыццё і дзейнасць тыпалітаграфій. Цыркуляр Мураўёва-вешальніка (у час паўстання ён займаў пасады генерал-губернатара Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў і галоўнага начальніка Віцебскай і Магілёўскай губерняў) абавязваў усіх уладальнікаў друкарскіх, літаграфскіх і фатаграфічных устаноў "прадстаўляць грашовае забеспячэнне ў выглядзе залогу за друкарню і літаграфію ад 300 да 1500 рублёў, а за фатаграфію – ад 200 да 600 рублёў" [9]. У канцы 1860-х гг. указ быў адменены, але ўведзена практыка абавязковага паручыцельства за добранадзейнасць уладальніка друкарскай установы з боку некалькіх асоб (звычайна па 5–7 чалавек), уладальнікаў нерухомай маёмасці. Тым не менш у 1880–1883 гг. у Мінску дзейнічала тайная друкарня, якая выдавала сацыял-рэвалюцыйны часопіс "Черный передел" [10].

Работа друкарняў і літаграфій вялася пад пільным цэнзурным наглядам жандармаў. Звесткі аб іх дзейнасці, таксама як і ўстаноўленая колькасць экзэмпляраў друкаванай прадукцыі, незалежна ад яе зместу, сцякаліся да "назіральніка за друкарнямі, літаграфіямі і іншымі падобнымі ўстановамі". Аднойчы праштрафіўшыся (несвоечасовы запіс у кнігу ўліку заказаў, незафіксаваныя матэрыялы ці незарэгістраваная гатовая прадукцыя), парушальнік парадку пападаў у чорны спіс да губернатара, што на працягу многіх гадоў псавала рэпутацыю прадпрымальніка. Адзін з такіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запісаў тычыцца Ш.М.Сохара, які "без належнага паліцэйскага дазволу і агульнай цэнзуры здзяйсняў цісненне малюнкаў і іншай друкаванай прадукцыі ў значнай колькасці" [11].

Атрымаць ліцэнзію на друкарскую дзейнасць было вельмі складана. Перш чым даць дазвол на адкрыццё друкарні, паліцэйскімі службамі на працягу некалькіх месяцаў высвятлялася палітычная добранадзейнасць асоб, адказных за вытворчасць. Афіцыйна і тайна збіралася каля дзесятка даведак з розных крыніц. Ліцэнзія выдавалася на два гады і толькі ў тым выпадку, калі цэнзурны нагляд не быў абцяжараны ніякімі абставінамі. Асаблівы недавер выклікалі яўрэі. Паказальна ў гэтым плане справа М.П.Анацэвіча, стацкага саветніка, вольна практыкуючага ўрача, які не змог атрымаць дазвол на друкарскую дзейнасць. Прычына адмовы высвятляецца з рапарта начальніка Мінскага жандармскага ўпраўлення пад грыфам "Совершенно доверительно" губернатару Мінска: «Па агентурных даных Анацэвіч з'яўляецца падстаўной асобай... Фактычна прадпрыемства будзе ў руках яўрэяў сумніцельнай палітычнай добранадзейнасці – былых рэцэнзентаў "Минского листка"» [12].

У адпаведнасці з законам аб друку (1865) у цэнтральных і заходніх губернях асабліва актыўна праводзілася палітыка русіфікацыі беларускага насельніцтва. Забаранялася выкарыстанне польскай мовы (беларускую мову лічылі вытворнай ад польскай) у грамадскіх месцах, нават у касцёлах абавязвалі праводзіць службу на рускай мове. Аднак поўнасцю выключыць з ужытку польскую і беларускую мовы ў краі з даўнімі культурна-гістарычнымі традыцыямі было немагчыма. У пачатку XX ст. у Мінску выдаваліся на прадпрыемстве В.А.Дворжыча штомесячныя часопісы на польскай мове "Абарона імя Марыі", "Пагоня". У друку выкарыстоўваліся таксама яўрэйская, радзей нямецкая і французская мовы.

У пачатку XX ст. выдавецкая прамысловасць ў Мінску мела добрую тэхнічную базу. Тут, акрамя звычайнай утылітарнай паліграфічнай прадукцыі, друкаваліся газеты "Слово", "Эхо", Курьер", "Минский голос", "Литовская Русь", "Минский огонёк" і інш. Актывізавалася паліграфічная справа пасля 1905 г., калі была адменена забарона на беларускамоўны друк. Частка матэрыялаў на беларускай мове друкавалася лацінкай, а частка кірыліцай. Свет убачылі такія выданні, як "Лучына" – літаратурна-навуковы штомесячны часопіс беларускай моладзі, "Саха" – беларускі штомесячнік па сельскай гаспадарцы [13]. Сярод шматлікіх дзелавых і інфармацыйных газет сваім мастацкім зместам вылучаўся літаратурна-грамадскі ілюстраваны часопіс "Минское обозрение" (рэдактар Е.Ф.Рубец), які ў сатырыка-гумарыстычным раздзеле змяшчаў карыкатуры, малюнкі жанравых сцэн. Толькі ў Мінску ў 1914 г. выдаваліся 26 перыядычных выданняў.


1. *Беларуская* энцыклапедыя: У 18 т. – Мн.: БелЭн, 1998. – Т. 6. – С. 221.
2. *Нацыянальны* гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 2810, 7770.
3. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 7749, арк. 5.
4. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 6784, арк. 6, 7.
5. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 3319.
6. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 7749, арк. 1.
7. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 7142, 7770.
8. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 6417.
9. *НГАБ.* Ф. 1430, воп. 1, т. 16, адз. зах.34731, арк. 1.
10. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 3490.
11. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 6251, арк. 3.
12. *НГАБ.* Ф. 295, воп. 1, адз. зах. 6418, арк. 4.
13. *Перыядычны* друк Беларусі. 1817–1916: Бібліяграфічны паказальнік. – Мн.: Рэд.-выд. аддзел пры Дзярж. б-цы БССР імя У.Леніна, 1960.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ